# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

13 снежня 2001 года, чацвер, № 18 (1847)


ПРЭЗЕНТАЦЫІ

## Выкладчыкі асвойваюць Інтэрнэт-тэхналогіі




*Падчас прэс-канферэнцыі ў РІВШ БДУ*

8 снежня на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта адкрыўся першы ў Беларусі Рэспубліканскі цэнтр Інтэрнэт-адукацыі.

Ён стане базай для навучання Інтэрнэт-тэхналогіям настаўнікаў усёй краіны. У цэнтры Інтэрнэт-адукацыі ўстаноўлены больш за 50 сучасных мультымедыйных камп'ютэраў, інфармацыйныя серверы, цэнтр падключаны да глабальнай сеткі Інтэрнэт каналам сувязі з прапускной магчымасцю 128 Кбіт/сек. Адначасова цэнтр можа прыняць для навучання 40 чалавек. (У лістападзе першая група ўжо распачала навучанне ў цэнтры.) Кожны год Інтэрнэт-тэхналогіі змогуць вывучаць не менш за тысячу работнікаў сярэдняй адукацыі Беларусі. Навучанне будзе весціся па арыгінальных праграмах. Асноўны пакет распрацаваны Маскоўскім цэнтрам Інтэрнэт-адукацыі.

Дарэчы, у многім за з'яўленне такога цэнтра наша краіна павінна быць ўдзячная расійскай Федэрацыі Інтэрнэт-адукацыі (ФІА) і нафтавай кампаніі "ЮКОС", якія сумесна рэалізуюць расійскі дзяржаўны праект "Пакаленне.RU".

Федэрацыя Інтэрнэт-адукацыі — некамерцыйная арганізацыя, створаная ў красавіку 2000 года. За час яе дзейнасці навучанне прайшлі больш за 14 000 чалавек. Інтэрнэт-цэнтры ўжо адкрыліся ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Томску, Варонежы, Новасібірску, Краснаярску і Самары, Нефцеюганску, Барнауле, Вялікім Ноўгарадзе, Белгарадзе, Іркуцку, Бранску, Растове-на-Доне, Улан-Удэ, Тамбове, Саранску і Цюмені. У рамках праекта ў 2000-2005 гадах адкрыюцца 50 цэнтраў Інтэрнэт-адукацыі, навучацца ў якіх будзе не менш за чвэрць мільёна работнікаў сярэдняй адукацыі. Цэнтр, створаны ў Мінску, — дзевятнаццаты па ліку і першы за межамі Расіі.

НК "ЮКОС" ужо інвеставала ў стварэнне беларускага Рэспубліканскага цэнтра Інтэрнэт-адукацыі 125 тысяч долараў ЗША. Штогадовыя дадатковыя інвестыцыі кампаніі ў забеспячэнне вучэбнай дзейнасці цэнтра прадугледжаны ў эквіваленце 140 тысяч долараў ЗША.

Трэба сказаць, што беларускі цэнтр Інтэрнэт-адукацыі ствараўся і адкрываўся пры непасрэднай падтрымцы ўрада нашай краіны і Беларускага дзяржаўнага універсітэта. БДУ ўзяў на сябе асноўную частку выдаткаў па рамонце і абсталяванні памяшканняў. У 2001-2005 гадах у рамках пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Федэрацыяй Інтэрнэт-адукацыі і Беларускім дзяржаўным універсітэтам дзяржава бярэ на сябе аплату канала сувязі з Інтэрнэтам.

У цырымоніі адкрыцця цэнтра Інтэрнэт-адукацыі з беларускага боку ўдзельнічалі міністр адукацыі Беларусі Пётр Брыгадзін, прэзідэнт НАН Беларусі Міхаіл Мясніковіч, прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а з расійскага — адказны сакратар Федэрацыі Інтэрнэт-адукацыі і віцэ-прэзідэнт нафтавай кампаніі "ЮКОС" Сяргей Манахаў, дырэктар Інтэрнэт-праграм ФІА Сямён Мушэр, а таксама старшыня каардынацыйнага савета ФІА, прэзідэнт Асацыяцыі маскоўскіх ВНУ, рэктар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта геадэзіі і картаграфіі, двойчы Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт Віктар Савіных. На адкрыцці прысутнічаў рэзідэнт-каардынатар ААН у Рэспубліцы Беларусь Ніл Бунэ.

Было падпісана афіцыйнае пагадненне паміж Міністэрствам адукацыі Беларусі і аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыяй ФІА аб супрацоўніцтве ў галіне ўкаранення Інтэрнэт-тэхналогій у адукацыю Беларусі.

*Вольга АНІНА*

*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*



*Заняткі ў Інтэрнэт-цэнтры ўжо распачаліся*

ПАДЗЕІ

## Падарунак ад інстытута імя Ота Хуга

У габеленавай зале рэктарата нашага універсітэта 6 снежня адбылося падпісанне дагавора пра бязвыплатную перадачу БДУ нямецкім інстытутам імя Ота Хуга ўстаноўкі па вытворчасці высакаякасных інфузійных раствораў, вельмі патрэбных беларускай медыцыне.

У працы гэтай установкі выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі, а атрыманыя прадукты адпавядаюць міжнародным стандартам. Вытворчасць інфузійных раствораў такой высокай якасці будзе арганізавана ў Беларусі ўпершыню. Кошт установкі — 1 200 000 нямецкіх марак.

З нямецкага боку дагавор падпісаў Эдмунд Ленгфельдэр — кіраўнік інстытута імя Ота Хуга.

Прафесар Ленгфельдэр — першы Ганаровы доктар БДУ. Такім чынам былі адзначаныя яго заслугі ў галіне радыебіялогіі і вялікі ўклад у аказанне Беларусі дапамогі ў працах па даследаванні вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. За 10 гадоў супрацоўніцтва праз яго інстытут нашай краіне было перададзена абсталяванне больш чым на 27 мільёнаў нямецкіх марак. У 1997 годзе прафесар Ленгфельдэр стаў першым замежнікам, узнагаraваным вышэйшай узнагародай Беларусі.

*Па інфармацыі прэс-службы БДУ*



ДЛЯ ЦЯБЕ

## На фестываль у Германію!

Невялікі гарадок Грайфсвальд на поўначы Германіі, ва Усходняй Памераніі. Хутка ён, напэўна, стане славутым не менш за Маскву ці Гавану, бо ў чэрвені наступнага года сюды з'едуцца студэнты з усіх кантынентаў. Тут з 1 па 9 чэрвеня пройдзе Сусветны фестываль студэнтаў.

Асноўны дэвіз фестывалю гучыць проста і запамінальна: "Наш свет — ваш выбар". І гэта азначае, што кожны студэнт таксама можа зрабіць свой выбар: дасláць да 12 студзеня 2002 года заяўку і стаць адным з 450 удзельнікаў фестывалю.

Праграма фестывалю ўключае лекцыі прафесіяналаў і дыскусіі па іх на актуальныя тэмы сучаснасці: праграма міру, правы чалавека, глабалізацыя, запазычанасці трэцяга свету, новыя незалежныя медыі, рэлігійная і культурная разнастайнасць, генетычная інжынерыя і агульнае здароўе. Але, вядома, у праграму ўваходзяць не толькі лекцыі — студэнты народ малады і вясёлы. Таму на фестывалі запланавана мноства культурна-забаўляльных мерапрыемстваў: спаборніцтвы, канцэрты, дыскатэкі, паходы, вогнішчы.

Аргкамітэт забяспечыць удзельнікам пражыванне (у студгарадку і сем'ях), харчаванне, медыцынскую страхоўку і наведванне ўсіх фестывальных мерапрыемстваў. Усе выдаткі, звязаныя з праездам, бярэ на сябе сам удзельнік мерапрыемства.

Афіцыйная мова фестывалю — англійская. Форма заяўкі на ўдзел у фестывалі знаходзіцца ў Інтэрнэце на сайце www.gristuf.org. Звяртацца можна таксама ва ўпраўленне міжнародных сувязяў БДУ (галоўны корпус БДУ, пакой 104, тэл. 209-53-32, тэл./факс 209-54-47).

*Вольга КАРАПЕЦЯН,*
*начальнік аддзела двухбаковага супрацоўніцтва і міжнародных адносін*

СЕМІНАРЫ

# Правы спажыўцоў у Еўропе

Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ 10 снежня правёў семінар "Еўрапейскае заканадаўства па абароне правоў спажыўца" з удзелам Крысціны Барэціні, прафесара універсітэта Турына (Італія). Як паведаміў дырэктар Цэнтра Юрый Чабатароў, на семінары абмяркоўваліся разнастайныя тэмы, датычныя абароны правоў спажыўцоў у краінах Еўропы: "Крыніцы еўрапейскага заканадаўства ў галіне абароны правоў спажыўца", "Абарона правоў спажыўца ва ўстаноўчых дакументах Еўрапейскага Саюза", "Дырэктывы па абароне правоў спажыўца: несправядлівыя ўмовы кантрактаў; інфармацыя і рэклама для спажыўца; бяспека і надзейнасць прадуктаў; дыстанцыйны і электронны гандаль".

Гэтае мерапрыемства прайшло ў рамках рэалізацыі праекта "Павышэнне магчымасцяў Цэнтра еўрапейскай дакументацыі — стварэнне сістэмы распаўсюджвання інфармацыі аб дзейнасці еўрапейскіх супольнасцяў і спрыяння еўрапейскім даследаванням", які ажыццяўляецца па праграме TACIC "Развіццё грамадзянскай супольнасці".

*Т. КУХАРЧУК*

ПОСТФАКТУМ

# Мы разам!

"Мы разам!" — менавіта пад гэтым дэвізам 3 снежня ў памяшканні кавярні "Гаўдэамус" адбылася вечарына, прысвечаная Дню інваліда. Ініцыятарамі мерапрыемства сталі прафсаюзны камітэт студэнтаў БДУ, БМГА "Розныя — Роўныя" і Саюз жанчын БДУ.

Цёплая, прыязная атмасфера вечарыны, мноства прыемных сюрпрызаў, цікавыя конкурсы — усё гэта не пакінула нікога з прысутных абыякавым. Вясёлыя гульні чаргаваліся з гутаркамі на сур'ёзныя тэмы: абмяркоўваліся надзвычай важныя пытанні стаўлення сучаснага грамадства да інвалідаў, узаемаадносіны ў асяродку людзей з абмежаванымі магчымасцямі і г.д.

Скончылася вечарына салодкімі пачастункамі і прыемнымі падарункамі.

*Кацярына МАРГОЛЬ,*
*студэнтка II курса*
*факультэта журналістыкі*

ФОТАПОЗІРК



*На выставе-кірмашы «Каменная казка»*

*Фота IREX/PROMEDIA*

З НАГОДЫ

# Дастаеўскі пасля Дастаеўскага

У лістападзе на філалагічным факультэце нашага універсітэта адбылося пасяджэнне круглага стала, прымеркаванае да 180-годдзя з дня нараджэння Ф.М. Дастаеўскага. У ім узялі ўдзел прадстаўнікі кафедры рускай літаратуры прафесар А.А. Станюта, дацэнт С.Ф. Кузьміна, дацэнт С.А. Пазняк, дацэнт Д.Л. Башкіраў, загадчыца кафедры доктар філалагічных навук С.Я. Ганчарова-Грабоўская, старшыня "Рускага таварыства ў Беларусі" М.І. Ткачоў, а таксама аспіранты і студэнты філалагічнага факультэта. Тэмай круглага стала былі абраныя словы Алеся Адамовіча "Дастаеўскі пасля Дастаеўскага". Асноўная дыскусія на пасяджэнні разгарнулася вакол праблемы: ці адбудзецца новае нараджэнне чытацкага і навуковага інтарэсу да Дастаеўскага на пачатку трэцяга тысячагоддзя, ці ён так і застанецца набыткам мінулага?

На пасяджэнні таксама распавядалася пра навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя Дастаеўскаму, адна з якіх адбылася ў Санкт-Пецярбургу (міжнародная), а другая — у Жыровічах.

Апроч арганізацыі круглага стала, кафедра рускай літаратуры філфака прыняла ўдзел і ў іншых мерапрыемствах, звязаных з юбілеем пісьменніка. Так, была арганізаваная выстава мастацкай і навуковай літаратуры пра Дастаеўскага, на міжнароднай навуковай канферэнцыі "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай" працавала асобная секцыя, прысвечаная Дастаеўскаму. А на ўрачыстым вечары ў Доме дружбы, прысвечаным юбілею пісьменніка, прафесар А.А. Станюта зрабіў спецыяльны даклад.

*Дзмітрый ПАРОМЕНСКІ,*
*аспірант кафедры рускай*
*літаратуры БДУ*

АСОБЫ

# Паэзія і ванна вінегрэту

На філалагічным факультэце стала ўжо добрай традыцыяй ладзіць сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі — як даўно прызнанымі і вядомымі, так і маладымі. Яно і зразумела: для філолагаў такія сустрэчы, як гаворыцца, хлеб надзённы.

Пачатак сёлетняй зімы быў адзначаны для факультэта менавіта такой сустрэчай. На гэты раз госцем студэнтаў стаў прызнаны мэтр беларускай паэзіі Генадзь Бураўкін — колішні выпускнік аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. На самым пачатку сустрэчы паэт прызнаўся ў сваёй любові да факультэта, на якім навучаўся, і сказаў, што абавязаны яму не толькі адукацыяй.



Па словах Генадзя Мікалаевіча, філфак даў яму жонку: яны пажаніліся, калі сам паэт быў пяцікурснікам, а яго абранніца навучалася на трэцім курсе. Вяселле было студэнцкім і па-сапраўднаму "багатым": "Аднаго вінегрэту дзяўчаты нагатавалі ванну", — распавёў Г. Бураўкін. І дадаў, што госці з'елі ўсё чысценька, а на потым "нічагусенькі не засталося".

Зрэшты, жонка — не адзіная повязь паэта з філалогіяй. Яго дачка таксама навучалася на беларускамоўным аддзяленні філалагічнага факультэта нашага універсітэта. І вядома ж, самае галоўнае, што лучыць Генадзя Мікалаевіча з цяперашнімі студэнтамі-філолагамі, — любоў да слова. Слова роднага, слова прыгожага, паэтычнага.

Таму і гучалі пасля гэтых "кароткіх уводзінаў у біяграфію" паэтычныя радкі. Вершы напаўнялі паветра залы, дзе на змену Бураўкіну-публіцысту з'яўляўся Бураўкін-сатырык, каб, у сваю чаргу, саступіць месца Бураўкіну-лірыку. Словы кружлялі над галовамі прысутных, спляталіся ў мудрагелістыя карункі то палымяных прамоваў, то шчырых споведзяў, то пранікнёных маленняў, а то і сапраўдных гімнаў каханню — і высокаму, і звычайнаму зямному... А верш "Непрыгожых жанчын не бывае" сарваў сапраўдныя апладысменты жаночай часткі залы, пагатоў што прадстаўніцы прыгожага полу складалі тры чвэрці залы (такая ўжо асаблівасць філфака!).

А потым пачалася самая "інтэрактыўная" частка сустрэчы — адказы на пытанні. Шмат было пытанняў і наконт творчасці, і наконт лёсу і жыццёвай пазіцыі паэта. Некаторыя, верагодна, могуць зацікавіць не толькі тых, хто прыйшоў на сустрэчу.

"У чым шчасце чалавека?"

— Адчуваць сябе патрэбным на Зямлі, патрэбным вось на гэтай беларускай зямлі.

"Што такое каханне?"

— А вы не знаеце? Тады ў вас наперадзе шмат адкрыццяў!

*М. ТАПІЛЯ*

ЮБІЛЕІ

# Кафедра заалогіі — адна з найстарэйшых

Кафедра заалогіі БДУ заснаваная ў 1921 годзе і з'яўляецца найстарэйшым цэнтрам падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для ВНУ, навукова-даследчых установаў біялагічнага профілю, запаведнікаў і нацыянальных паркаў Беларусі.

У розны час на кафедры працавалі такія вядомыя заолагі і экологі, як прафесар А.У. Фядзюшын — заснавальнік фаўністычнага накірунку ў даследаваннях жывёльнага свету нашай рэспублікі, акадэмік АН СССР Л.А. Зянкевіч, член-карэспандэнт АН СССР прафесар Г.Г. Вінберг, які паклаў пачатак гідраэкалагічным даследаванням у Беларусі, акадэмік АН Беларусі П.Ф. Ракіцкі, прафесар І.К. Лапацін і шэраг іншых навукоўцаў.

За гады працы калектыў кафедры падрыхтаваў каля тысячы спецыялістаў-заолагаў, з іх 18 дактароў і 50 кандыдатаў біялагічных навук, якія працуюць у акадэмічных інстытутах, універсітэтах і навуковых калектывах Беларусі, Расіі, Украіны і іншых краінаў. Няма такога куточка рэспублікі, дзе б не працавалі выпускнікі кафедры. Яны вядуць даследаванні ў лабараторыях многіх краінаў свету, у тым ліку ў ЗША, Сірыі, Балгарыі, на Кубе. Пры кафедры заалогіі адкрытыя дактарантура, аспірантура і магістратура.

Выкладчыкі кафедры, аспіранты і магістранты вядуць вялікую даследчую працу ў галіне вывучэння біяразнастайнасці, сістэматыкі і экалогіі жывёлаў, марфалогіі, фенетыкі і па іншых накірунках заалогіі.

Супрацоўнікамі кафедры выдадзеныя падручнікі і метадычныя дапаможнікі, якія шырока выкарыстоўваюцца студэнтамі нашай краіны і атрымалі высокую ацэнку навуковай грамадскасці Расіі і шэрага іншых еўрапейскіх краінаў.

*І.К. ЛАПАЦІН, прафесар*
*А.С. ШАЛАПЁНАК,*
*дацэнт кафедры заалогіі*

# З гісторыі заалагічнага музея

Заалагічны музей быў заснаваны ў 1921 годзе па ініцыятыве прафесара А.У. Фядзюшына. Актыўны ўдзел у стварэнні і фармаванні заалагічных калекцый першапачаткова прымалі прэпаратары М.В. Дабратворскі, А.К. Ціток, У.У. Слесарэвіч, студэнты, а потым супрацоўнікі факультэта І.М. Сяржанін, А.В. Нікіценак, П.П. Прыбышчук, Л.П. Шкляроў, А.А. Міцянін і многія іншыя.

У даваенны час калекцыйны фонд музея налічваў больш за 4000 адзінак захоўвання. Падчас Вялікай Айчыннай вайны асноўная частка калекцыйнага фонду была страчаная. У пасляваенны перыяд экспазіцыя і навуковыя калекцыі былі аднаўленыя і значна пашыраныя. Гэтаму спрыялі шматлікія экспедыцыі супрацоўнікаў музея і карпатлівая праца прэпаратараў, мастакоў, таксідэрмістаў і выкладчыкаў факультэта.

Зараз калекцыйны фонд музея размяшчаецца на плошчы 1200 кв. м і з'яўляецца самым буйным у краіне зборам заалагічных аб'ектаў (чучал, тушак, птушыных кладак і г.д.) агульным лікам больш за 110 000 адзінак захавання. У заалагічных калекцыях захоўваецца 258 відаў, занесеных у Чырвоныя кнігі краінаў СНД і іншых краінаў свету. Тут можна пабачыць тыпавыя серыі новых для навукі відаў, унікальныя заалагічныя матэрыялы XIX-XX стагоддзяў.

Штогод заалагічны музей наведваюць больш за 8000 чалавек. Пры музеі створаны адзіны рэспубліканскі цэнтр заалагічных калекцый імя А.У. Фядзюшына. Заалагічныя калекцыі музея выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы шэрага буйных манаграфій — "Птушкі Беларусі", "Млекакормячыя Беларусі", "Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь" і г.д., а таксама мноства навуковых артыкулаў.

Зараз супрацоўнікі музея працуюць над стварэннем новай сістэматычнай экспазіцыі, ландшафтна-экалагічных дыярам і біягруп. Асноўным накірункам дзейнасці музея традыцыйна застаецца камплектаванне, захоўванне і навуковая апрацоўка заалагічных калекцый, развіццё на гэтай аснове навукова-асветніцкай працы, якая спрыяе экалагічнай адукацыі і папулярызацыі ідэй аховы прыроды.

Да 80-годдзя БДУ заалагічны музей атрымаў цудоўны падарунак: дзякуючы падтрымцы рэктара БДУ прафесара А.У. Казуліна тут з'явілася сучаснае абсталяванне. Упершыню за ўсю 80-гадовую гісторыю ў музеі адбылася поўная змена экспазіцыйнай мэблі.

*А.Д. ПІСАНЕНКА,*
*загадчык заалагічнага музея БДУ*

АБ'ЯВЫ

# Факультэт кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ

*аб'яўляе конкурс*
*на замяшчэнне пасад:*

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: эканомікі і кіравання бізнесам, замежных моў, дзяржаўнага права;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: эканомікі і кіравання бізнесам (2), гуманітарных дысцыплін (1);

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ замежных моў (2).

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, факультэт кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.*

# Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

*аб'яўляе конкурс*

на замяшчэнне вакантнай пасады навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі статыстычнага аналізу і мадэлявання ва ўстанове Беларускага дзяржаўнага універсітэта "Нацыянальны навукова-даследчы цэнтр прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі".

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220050, г. Мінск, прасп. Ф. Скарыны, 4, п. 337, ННДЦ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, тэл. 209-50-42.*

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# Выданні БДУ

*За гэты год у БДУ выйшлі ў свет больш за 200 выданняў. Сярод іх вучэбныя, навуковыя, даведачныя выданні, кнігі з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Навукова-метадычнага цэнтра вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі Беларусі, вучэбна-метадычныя комплексы, курсы лекцый, манаграфіі.*

*Напрыканцы лістапада ў Навукова-метадычным цэнтры вучэбнай кнігі і сродкаў навучання праходзіла выстава "Нацыянальныя падручнікі для педагагічнай адукацыі", дзе была прадстаўлена вучэбная літаратура, выдадзеная за апошнія 5 гадоў для студэнтаў і навучэнцаў педагагічных спецыяльнасцяў ВНУ і ССНУ, метадычныя распрацоўкі. На гэтай выставе экспанаваліся і выданні, якія пабачылі свет у БДУ.*

*Сёння мы прапануем вам толькі некаторыя кнігі. Усе яны ёсць у Фундаментальнай бібліятэцы БДУ, дзе зацікаўленыя могуць пазнаёміцца з выданнямі больш блізка. У далейшым рэдакцыя "Беларускага універсітэта" мяркуе ўвесці пастаянную рубрыку, у якой чытачы газеты змогуць пазнаёміцца з кніжнымі навінкамі БДУ.*

П.М. Бычковский, Р.П. Попок, Л.С. Полякова. Педагогическая деятельность в детском оздоровительном центре. Навучальны дапаможнік выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і рэкамендацыяй Навукова-метадычнага цэнтра вучэбнай кнігі і сродкаў навучання. У кнізе з пазіцый сучаснай педагагічнай навукі раскрываецца сутнасць арганізатарскай і выхаваўчай дзейнасці ў дзіцячым летніку.



П.М. Бычковский, Р.П. Попок, Л.С. Полякова. Психолого-педагогическая деятельность вожатых в детском оздоровительном лагере. Навучальны дапаможнік выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У кнізе з пазіцый сучаснай педагагічнай навукі раскрываецца сутнасць арганізатарскай і выхаваўчай дзейнасці ў дзіцячым летніку.

П.М. Бычковский, А.М. Орлов, Р.П. Попок, А.Н. Дамарад, Л.С. Полякова (составители). Наполним музыкой сердца. Сборник текстов песен. У кнізе апублікаваны тэксты песень, якія набылі вялікую папулярнасць сярод тых, хто адпачывае ў дзіцячых цэнтрах, — дзіцячыя, аўтарскія, эстрадныя.

Е.И. Дмитриев. Социология журналистики. Конспект лекций. Кніга адрасуецца выкладчыкам, аспірантам, студэнтам факультэтаў журналістыкі і аддзяленняў сацыялогіі, а таксама журналістам, якія працуюць у сродках масавай інфармацыі, рэкламных агенцтвах, службах па сувязях з грамадскасцю.

В.Т. Ерофеенко, И.С. Козловская. Уравнения с частными производными с приложениями в экономике. Курс лекций. У выданні даецца класічны курс па дыферэнцыйных ураўненнях з адвольнымі вытворнымі.

И.Л. Зеленкова. Учебно-методический комплекс по курсу "Этика" на основе современных образовательных технологий. У распрацоўцы змешчаны комплекс інфармацыйных і метадычных матэрыялаў, неабходных для мэтанакіраванай арганізацыі працэсу вывучэння студэнтамі курса этыкі.

Л.С. Ивашкевич, Т.П. Каратаева, А.С. Ляхов. Рентгенографические методы в химических исследованиях. Навучальны дапаможнік выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Кніга прысвячаецца пытанням, звязаным з вывучэннем полікрышталічных аб'ектаў.

Т.П. Каратаева. Основы кристаллохимии. Навучальны дапаможнік выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У кнізе выкладаюцца спосабы апісання крышталічных структураў, а таксама асновы рэнтгенаструктурнага аналізу як асноўнага метаду іх даследавання.

А.К. Кіклевіч, А.А. Кожынава, І.У. Кур'ян. Польская мова. Курс лекцый. Дапаможнік змяшчае найбольш важныя звесткі пра фанетыку, графіку, марфалогію, сінтаксіс, арфаграфію і пунктуацыю польскай мовы.

А.Н. Курбацкий. Проектирование информационно-технологических систем. Курс лекций. У кнізе разглядаецца праблема аўтаматызацыі і аптымізацыі кіраўнічай дзейнасці, якая разглядаецца праз прызму аўтаматызацыі і аптымізацыі прыняцця кіраўнічых рашэнняў і дакументазвароту органа кіравання.



А.А. Лабуда, Н.Н. Никифоренко. Физическая микроэлектроника. Курс лекций. У дапаможніку выкладаюцца фізічныя заканамернасці, якія ляжаць у аснове функцыянавання інтэгральных мікрасхемаў, фізічныя асновы планарнай тэхналогіі мікраэлектронікі, а таксама спосабы аператыўнага спектральнага кантролю і кіравання вакуумна-плазменнымі тэхналагічнымі працэсамі нанясення і траўлення тонкіх плёнак.

Ф.М. Литвинко. Методика изучения разделов школьного курса русского языка. Курс лекций. У кнізе выкладаюцца метадычныя прынцыпы і метады навучання рускай мове.

Л.В. Лойко. Основы дипломатии. Дипломатическая служба. Кніга выйшла ў серыі "Падручнікі БДУ". Яна змяшчае інфармацыю пра задачы, структуру, функцыі, асноўныя накірункі, формы дзейнасці дыпламатычнай службы Беларусі і іншых краінаў свету.

В.И. Малюгин. Рынок ценных бумаг: количественные методы анализа. Навучальны дапаможнік, выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца паслядоўным матэматычна строгім выкладам колькасных метадаў аналізу рынку каштоўных папераў ва ўмовах няпэўнасці.

Г.А. Медведев. Математические модели финансовых рисков. В двух частях. Часть 2. Риски страхования. Навучальны дапаможнік выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У кнізе выкладаюцца асноўныя раздзелы курса "Матэматычныя мадэлі фінансавай рызыкі", якія датычаць рызыкі страхавання.

А.В. Мощенский, В.А. Мощенский. Курс математической логики. Навучальны дапаможнік выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У ім выкладаюцца ўсе панацці курса матэматычнай логікі, асноўная ўвага надаецца тэмам "прэдыкаты" і "алгарытмы".

С.Г. Мулярчик. Численные методы. Конспект лекций. У кнізе выкладаюцца лікавыя метады прыбліжэння функцый, вылічэння пэўных інтэгралаў, рашэння сістэмаў лінейных і нелінейных алгебраічных ураўненняў, сістэмаў звычайных дыферэнцыйных ураўненняў.



А.А. Соколовский. Исполнительная власть в Республике Беларусь. У манаграфіі на значным фактычным матэрыяле аналізуецца дзейнасць Савета Міністраў Беларусі і падведамных яму органаў выканаўчай улады.

А.Е. Супрун. Исследования по лингвистике текста. У зборніку артыкулаў, прысвечаным памяці навукоўца, змяшчаюцца яго артыкулы па структуры, лексічных і граматычных характарыстыках тэксту і метадах яго вывучэння.

П.П. Украинец. Менеджмент. Новые технологии. У кнізе падаюцца разнастайныя формы выкладання і вывучэння дысцыпліны на аснове патрабаванняў сучасных адукацыйных тэхналогій.



Ю.С. Харин, С.В. Агиевич. Компьютерный практикум по математическим методам защиты информации. Навучальны дапаможнік выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Гэта першы айчынны камп'ютэрны практыкум па новым актуальным накірунку прыкладной матэматыкі — матэматычных метадах абароны інфармацыі.

Чтения, посвященные памяти П.П. Шубы (к 75-летию со дня рождения). Сборник научных статей. У зборніку змяшчаюцца артыкулы калег і вучняў П.П. Шубы, звязаныя з яго навукова-педагагічнай творчасцю.

А.П. Шилин. Задания по дифференциальным уравнениям. Навучальны дапаможнік выдадзены з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У кнізе прыводзяцца шматварыянтныя заданні па шэрагу найважнейшых тэмаў курса дыферэнцыйных ураўненняў і адказы на іх.

*Падрыхтаваў Л. МІЦЕЎ*

ФОТАПОЗІРК



*На выставе-кірмашы «Каменная казка»*

*Фота IREX/PROMEDIA*

РЫХТУЙСЯ ЗАГАДЗЯ

## Алімпіяды па геаграфіі

Сёлета ў мінскім выдавецтве "Тэхналогія" выйшаў дапаможнік для настаўнікаў "Алімпіяды па геаграфіі". Яго аўтары — пастаянны старшыня журы рэспубліканскіх алімпіядаў па геаграфіі, прэзідэнт Беларускага геаграфічнага таварыства, загадчык кафедры глебазнаўства і геалогіі геаграфічнага факультэта БДУ, прафесар В.С. Аношка, пастаянны член журы рэспубліканскіх алімпіядаў па геаграфіі, намеснік дэкана геафака па навуковай рабоце дацэнт М.М. Брылеўскі, галоўны інспектар Міністэрства адукацыі па геаграфіі Н.М. Ганушчэнка.

У дапаможніку змяшчаюцца заданні рэспубліканскіх і абласных алімпіядаў па геаграфіі, праведзеных у Беларусі за 10-гадовы перыяд (1991-2000 гг.). Пытанні тэарэтычнага тура накіраваныя на выяўленне асноўных геаграфічных заканамернасцяў развіцця мацерыкоў і краінаў, экалагічных праблемаў Беларусі. Прыводзяцца і шматлікія тэставыя заданні з розных галінаў геаграфічных ведаў (у тым ліку — і з займальнай геаграфіі), а таксама пытанні практычнага тура. Акрамя таго, у дапаможніку ёсць асобныя прыклады заданняў з замежных і міжнародных алімпіядаў па геаграфіі, распавядаецца пра спецыфіку іх правядзення.

Выданне вылучаецца добрай структурай, яно багата праілюстраванае картасхемамі і малюнкамі, змяшчае адказы на тэсты. Кніга разлічаная на настаўнікаў геаграфіі, вучняў школаў і гімназій, а таксама на ўсіх, хто цікавіцца геаграфіяй. На думку аўтараў, яе можна выкарыстоўваць для распрацоўкі заданняў на праграмныя ўрокі па геаграфіі, пры правядзенні факультатываў і пазакласных мерапрыемстваў, для падрыхтоўкі вучняў да алімпіядаў рознага ўзроўню і паступлення ў ВНУ.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*студэнт геаграфічнага факультэта БДУ*

ФОТАПОЗІРК



*На выставе-кірмашы «Каменная казка»*

*Фота IREX/PROMEDIA*

ВЕСТКІ З БІБЛІЯТЭКІ

## У дапамогу чытачу

Як зарыентавацца ў кніжным фондзе бібліятэкі? Дзе знайсці патрэбную кнігу? Гэтыя пытанні хвалявалі чытачоў бібліятэкі з першых дзён яе заснавання. Сёння да гэтай старой праблемы для супрацоўнікаў бібліятэкі дадаюцца і новыя: забяспечыць навуковы, навучальны і выхаваўчы працэсы ва універсітэце, прадаставіць доступ карыстальнікам да сусветных інфармацыйных рэсурсаў. Шмат у чым дапамагае ўкараненне ў даведачна-бібліяграфічную і інфармацыйную працу аўтаматызаваных сродкаў пошуку, стварэння, захоўвання і распаўсюджвання інфармацыі, што вядзецца ў апошнія гады. Так, у мінулым годзе бібліятэка атрымала 6 поўнатэкставых баз даных на CD-ROM кампаніі EBSCO Publishing (у рамках праграмы EIFL Direct). Гэтыя базы даных уключаюць больш за 4 тысячы назваў часопісаў, газет, рэфератыўных аглядаў на англійскай мове.

Разам з цэнтрам інфармацыйных тэхналогій БДУ бібліятэка рэалізуе праект "Электронная дастаўка дакумента", які дазволіць карыстальнікам заказваць копіі дакументаў з бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў Расіі, СНД, краінаў далёкага замежжа, а таксама стварыць фонд электронных рэсурсаў БДУ.

Таксама ствараюцца базы даных "Артыкулы" гуманітарнай і сацыяльнай тэматыкі, "Праблемы вышэйшай школы", "Веснік БДУ".

Больш падрабязна з пералікам паслуг, якія прадастаўляе аддзел даведачна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай работы, можна азнаёміцца непасрэдна ў аддзеле ці ў Інтэрнэце па адрасе http://anubis.bsu.unibel.by.

*Т.І. МІЦЮХІНА,*
*загадчыца аддзела даведачна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай работы Фундаментальнай бібліятэкі*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Навуковы асяродак матуліных песень

## Да 20-годдзя НДЛ беларускага фальклору

Фалькларыстычная праца ў БДУ пачалася практычна ад самага моманту заснавання універсітэта, у чым прымаў удзел фалькларыст, прафесар Маскоўскага універсітэта М. Янчук.

У 20-я гады фалькларыстычную эстафету ў БДУ прадоўжыў Якуб Колас, які ўзначаліў фальклорную камісію Інстытута беларускай культуры. Па яго закліку студэнты універсітэта збіралі фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, якія шырока друкаваліся ў перыёдыцы.

У 60-я гады гэтую працу ўзначалілі і плённа вялі нашыя выдатныя навукоўцы-фалькларысты Н. Гілевіч і В. Захарава. Ужо да пачатку 1970-х гадоў на філфаку БДУ былі сабраны матэрыялы з 20 цэнтральных і паўночных раёнаў і з 25 раёнаў Палесся.

Вынікам працы сталі створаныя фальклорныя архівы кафедраў беларускай і рускай літаратур, а да фалькларыстычнай працы далучылася большасць членаў гэтых кафедраў. Студэнты-ўдзельнікі фальклорных экспедыцый на аснове сабраных матэрыялаў пісалі і цяпер пішуць цікавыя, арыгінальныя курсавыя і дыпломныя працы, а выпускнікі факультэта Р. Кавалёва, Л. Тарасюк, Р. Яраслаўцава, Т. Валодзіна, В. Шарая і іншыя абаранілі кандыдацкія дысертацыі і сталі выкладчыкамі універсітэта і супрацоўнікамі Акадэміі навук.

Па цэнтральна-паўночных запісах Н. Гілевіч выдаў фундаментальныя зборнікі "Песні сямі вёсак", "Песні народных свят і абрадаў", "Казкі і апавяданні беларусаў" і інш.

Унікальныя запісы на Палессі склалі серыю "Беларускі фальклор у сучасных запісах", у якой выйшлі зборнікі "Традыцыйныя жанры Брэсцкай вобласці", "Традыцыйныя жанры Гомельскай вобласці" і г.д.

20 гадоў таму на філфаку БДУ была створана навукова-даследчая група, якая ў 1985 годзе стала навукова-даследчай лабараторыяй беларускага фальклору і дыялекталогіі.

Асноўны рэгіянальны архіў налічвае цяпер больш за 3,5 мільёна тэкставых запісаў усіх жанраў фальклору. Найбольш цікавыя запісы зроблены студэнтамі-завочнікамі, якія стала назіраюць за развіццём фальклорнай традыцыі. Кожны год у архівы НДЛ паступае каля паўмільёна тэкставых, аўдыё- і нават відэазапісаў. Рэгіянальны архіў даў магчымасць НДЛ філфака супрацоўнічаць з геаграфічным факультэтам, з кафедрай этнаграфіі гістарычнага факультэта, з раённымі аддзеламі адукацыі і культуры.

Рэгіянальны архіў НДЛ перакапіраваны і сістэматызаваны для ўводу ў навуковы ўжытак у жанравым архіве. Жанравы архіў стаў асновай падрыхтоўкі матэрыялаў да друку, камп'ютэрнай апрацоўкі і ўвядзення ў Інтэрнэт, дзеля чаго мы пачалі супрацоўніцтва з кафедрай інфармацыйных тэхналогій у культуры Беларускага універсітэта культуры.

Ужо даўно пачалася аўдыёфіксацыя песенных мелодый на магнітных стужках. Натацыяй напеваў са стужак плённа займаліся ў розныя часы Г. Цітовіч, У. Раговіч (які падрыхтаваў трохтомнае выданне песеннага фальклору Палесся), кваліфікаваная музыказнаўца, выпускніца кансерваторыі Г. Кутырова, а ў наш час — Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі М. Сірата.

З самага пачатку існавання ў лабараторыі працягвалася збіральніцкая дзейнасць па дыялекталогіі, узначаленая кандыдатам навук В. Трайкоўскай. Потым гэтую працу плённа вёў кандыдат навук М. Антропаў.

Адзіная магчымая форма існавання фальклору — вусная — набыла ў наш час беспрэцэдэнтную па каштоўнасці форму відэафіксацыі. У НДЛ з 1987 года з пачаткам супрацоўніцтва з тэлебачаннем пачаў стварацца відэаархіў цікавых самабытных формаў фальклору і традыцыйнай культуры.

Звышважная праблема — тое, што запісы на аўдыё- і відэастужках недаўгавечныя. Практычна вечнымі будуць запісы на электронных носьбітах. Мы спадзяемся, што на дапамогу ў гэтай высакароднай справе нам прыйдзе факультэт радыёфізікі і электронікі і журфак, якія маюць патрэбную тэхніку. Але мы і самі пачалі працу: зрабілі сістэмную мадэль фальклору для ўводу яе ў Інтэрнэт, падрыхтавалі глебу для капіравання матэрыялаў.

Не менш важным з'яўляецца і выданне сабраных матэрыялаў. Штогод за ўвесь перыяд існавання супрацоўнікі НДЛ выдавалі не менш за 50 друкаваных аркушаў, каля 100 навуковых артыкулаў, тэзісаў, дакладаў, метадычных распрацовак. Пераважна гэта навукова-фальклорныя зборнікі: "Песня — душа народа", "Слова міма не ляціць", "Спадчына маёй маці", кніга-альбом "Рыгор Шырма", манаграфія "Святы і абрады беларусаў" і г.д.

НДЛ плённа супрацоўнічае з усімі абласнымі і большасцю галіновых універсітэтаў, акадэміямі, нават з Мінскім мединстытутам дзеля выхавання здаровага ладу жыцця праз фальклор як сродак аптымізму, маральнага, духоўнага і эстэтычнага здароўя народа.

Цяпер лабараторыя мае ў сваім складзе 4 штатных і 14 пазаштатных супрацоўнікаў. Асабліва хочацца адзначыць фальклорны калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ ўсіх факультэтаў "Тутэйшая шляхта", які ўзначальвае музыка, кампазітар, кандыдат хімічных навук Л. Махнач. Ужо другі год ён, іншыя кампазітары і фальклорныя калектывы ажыццяўляюць гісторыка-мастацкі праект "Спевы пра даўніх ліцьвінаў да 1434 года" Яна Чачота ў высокамастацкіх перакладах з польскай мовы К. Цвіркі і С. Судніка.

Рукамі студэнтаў БДУ і іншых ВНУ Беларусі штогод папаўняюцца ўсе 4 архівы НДЛ. Супрацоўнікі НДЛ (асабліва актыўна — М. Котаў) клапоцяцца пра папулярызацыю фальклору ў перыядычным друку, на радыё і тэлебачанні, у канцэртах, на святах. Са створаным пры лабараторыі Нацыянальным ансамблем фальклору М. Котаў выступаў у Францыі, ЗША. Нядаўна ён выдаў зборнік гульняў, жартаў, пажаданняў, а на чарзе —даследаванне пра народныя танцы.

Мэтанакіравана даследуе гістарыяграфію беларускага фальклору кандыдат навук А. Літвіновіч, які абараніў дысертацыю і падрыхтаваў манаграфію пра маладаследаваны перыяд беларускай фалькларыстыкі другой паловы XIX — пачатку XX стст. Цяпер ён актыўна даследуе фальклор беларуска-польскага, беларуска-літоўскага і беларуска-латышскага памежжа.

З працай А. Амбразевіча і будучых падобных асаў у камп'ютэрнай тэхніцы мы звязваем надзеі на рынкавае выкарыстанне фальклорных матэрыялаў.

НДЛ беларускага фальклору БДУ з'яўляецца калектыўным членам Міжнароднай арганізацыі па фальклоры ЮНЭСКА (IOF) і найбольш актыўным членам яе камісіі рэгіянальнага даследавання фальклору. Архівы НДЛ улічваюцца ў працы камісіі, уключаны ў даведнік, які рыхтуецца да друку ў Амерыцы.

У адпаведнасці з рэкамендацыямі ЮНЭСКА пра інтэлектуальную ўласнасць і ўзятымі Беларуссю абавязацельствамі аб ахове фальклору, а таксама з прынятым Палатай прадстаўнікоў Беларусі Законам аб захаванні фальклору, архівы НДЛ беларускага фальклору рэкамендаваны экспертным саветам БДУ для ўключэння ў Дзяржаўны рэестр навуковых аб'ектаў, якія складаюць нацыянальны здабытак.

Паколькі ва ўсім цывілізаваным свеце навуковыя цэнтры развіваюцца пераважна пры універсітэтах, дзе ёсць магчымасць непасрэдна перадаць наступнаму пакаленню навукоўцаў назапашаныя веды і вопыт, будучыня НДЛ беларускага фальклору падаецца перспектыўнай і плённай. Існаванне НДЛ можа стаць глебай для стварэння навукова-даследчага інстытута этналогіі пры філфаку БДУ.

*Васіль ЛІЦЬВІНКА,*
*загадчык НДЛ беларускага фальклору*
*пры кафедры тэорыі літаратуры філфака БДУ*



*Васіль Ліцьвінка на рэгіянальным свяце «А гармонік грае» ў Жыткавічах*



*Нацыянальны ансамбль фальклору «Вячоркі». Кіраўнік — Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Мікалай Сірата*

А Ў НАС! А Ў ВАС?

# Выпрабуйце сябе

Ужо два гады таму клуб арыентавання БДУ ўступіў у Беларускую федэрацыю арыентавання, і з таго часу каманда універсітэта актыўна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх мерапрыемствах. Толькі сёлета каманда прыняла ўдзел у 30 спаборніцтвах па 58 відах спорту.

Самымі ўдалымі былі выступы каманды на спаборніцтвах паміж ВНУ. Так, на рэспубліканскім турысцкім злёце студэнтаў каманда нашага універсітэта заняла першае месца па арыентаванні. У рэспубліканскіх студэнцкіх гульнях каманда заняла агульнае першае месца (набрала 262 ачкі, апярэдзіўшы бліжэйшых сапернікаў на 80 ачкоў). Гераіняй гульняў была выпускніца геаграфічнага факультэта Таццяна Васкабойнікава, якая змагла стаць трохразовай пераможцай.

Па выніках года, у дзесятку найлепшых арыенціроўшчыкаў краіны ўвайшоў Сяргей Пісарчык (V курс, факультэт радыёфізікі і фізічнай электронікі).

За год клуб правёў 5 мерапрыемстваў. У рамках універсітэцкай спартакіяды было праведзена першынство па спартыўным арыентаванні, на якім камандную перамогу атрымаў геаграфічны факультэт. Чэмпіёнамі універсітэта сталі ўжо згаданая Таццяна Васкабойнікава і Пётр Кухто (ФРФіЭ). У кастрычніку прайшло першынство, прысвечанае 80-годдзю БДУ (першае месца зноў заняла каманда геафака).

У маі і кастрычніку клуб дапамагаў арганізоўваць традыцыйныя адкрытыя спаборніцтвы па арыентаванні біялагічнаму факультэту і факультэту радыёфізікі і электронікі.

У лістападзе быў праведзены трэці мемарыял "Надзея", прысвечаны памяці С.Ф Рыжанкова, які шмат зрабіў для прапаганды арыентавання і здаровага ладу жыцця сярод студэнтаў.

Клуб арыентавання БДУ заўсёды з радасцю сустрэне ўсіх, хто жадае выпрабаваць сябе, хто жадае весці здаровы лад жыцця.

*В.В. КРАСІЛЬНІКАЎ,*
*старшы выкладчык кафедры*
*фізвыхавання і спорту*

ПАДПІСКА — 2002

# "Веснік БДУ"

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2002 года. Падпісная цана на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" па серыях наступная:

Серыя I (індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень; № 2, май):
індывідуальная — 3454 р.;
ведамасная — 6738 р.

Серыя II (індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты; № 2, чэрвень):
індывідуальная — 3454 р.;
ведамасная — 6738 р.

Серыя III (індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік):
індывідуальная — 1727 р.;
ведамасная — 3369 р.

Серыя IV (індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 1, красавік):
індывідуальная — 1727 р.;
ведамасная — 3369 р.

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

*Рэдакцыя і рэдкалегіі часопіса*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*13 снежня 2001 года*

*Падпісана да друку 12.12.2001*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 480. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк*

*Камп'ютэрная вёрстка Андрэя Мікулевіча*
*Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.*